**26 жніўня 2023 года - 65 гадоў з дня нараджэння УЛАДЗІМІРА ВАСІЛЬЕВІЧА ШАПЕЦЮКА (1958-1980), ваеннага лётчыка, воіна-інтэрнацыяналіста**



Уладзімір Васільевіч Шапяцюк нарадзіўся 26 жніўня 1958 года ў в. Лелікава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Маці, Марыя Нікандраўна – пенсіянерка, бацька, Васілій Аляксандравіч, – загінуў у аўтакатастрофе ў 1975 годзе. У сям'і засталіся пяцёра дзяцей, Валодзя быў старэйшым. Давялося дапамагаць маці, усе мужчынскія справы ў доме і на двары выконваў сам. Вельмі клапаціўся аб малодшых сёстрах і братах.

У 1975 годзе Уладзімір скончыў Лелікаўскую сярэднюю школу. З дзяцінства марыў пра самалёты і верталёты, таму цвёрда вырашыў паступаць у авіяцыйнае вучылішча.

З 1976 года Уладзімір Шапяцюк вучыўся ў Саратаўскім авіяцыйным вучэбным цэнтры, у 1978 годзе стаў курсантам Вязнікаўскага авіяцыйнага цэнтра ДТСААФ. У 1979 годзе скончыў Саратаўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў, атрымаў сярэднюю ваенна-спецыяльную адукацыю пілота-тэхніка. Служыў у Грузінскай ССР.

З кожным годам усё далей ад нас вайна ў Афганістане, аднак не гасне ў памяці вечны боль ад страт, якія не абмінулі і Кобрыншчыну. У Афганістан Уладзімір Шапяцюк трапіў у маі 1980 года. Здзейсніў 115 баявых вылетаў, ажыццяўляючы суправаджэнне транспартных верталётаў і агнявую падтрымку з паветра мотастралковых падраздзяленняў.

18 кастрычніка 1980 года баявы верталёт «Ми-24» быў збіты ў час атакі на апорны пункт праціўніка і пацярпеў катастрофу ў 52-х кіламетрах на поўнач ад Джэлалабада. Экіпаж з трох чалавек, у складзе якога быў лётчык-аператар лейтэнант У. В. Шапяцюк, загінуў.

Пахаваны на могілках у в. Лелікава. На магіле героя побач з мармуровым помнікам узвышаецца лопасць шрубакрылай машыны, якая сімвалізуе апошні палёт лейтэнанта. На лопасці – ахоўны знак.

У 1981 годзе лейтэнант У. В. Шапяцюк узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна). Наш зямляк дастойна выканаў свой доўг перад Радзімай, паступіў так, як павінен

паступаць афіцэр. У складаных умовах савецкія воіны праяўлялі стойкасць, мужнасць і сілу духа.

У Лелікаўскай сярэдняй школе створаны куток памяці Уладзіміра Шапецюка, яго імя прысвоена піянерскаму атраду школы. З 2004 года школа носіць імя У. В. Шапецюка. У 2006 годзе на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

На дарогах Кобрынскага раёна і вуліцах Кобрына ў 2002 годзе можна было ўбачыць аўтобус, на якім буйнымі літарамі напісана «Владимир Шепетюк», а вышэй, меншымі, што гэты аўтобус названы ў гонар нашага земляка – ваеннага лётчыка, які загінуў у небе Афганістана, і зроблены з металічнага лому, сабранага піянерамі Кобрыншчыны.

У Кобрыне на вул. Леніна створаны сквер воінскай славы, дзе 15 лютага 2010 года адкрыты памятны знак – верталёт Ми-8 на пастаменце, прысвечаны землякам воінам-інтэрнацыяналістам. 15 лютага 2020 года побач адкрыты помнік героям (скульптар Генадзь Сямёнавіч Абрамаў).

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2018 г., дапоўнены ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, гал. бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 447-448. - (Загінулі ў Афганістане).

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Афганістан. - Мінск, 1991. - С. 470-471.

**Суворов, А. М.** Воины-интернационалисты Кобринского района / А. М. Суворов // На линии огня воины-интернационалисты Брестской области в Афганской войне / А. М. Суворов. - Брест, 2010. - С. 174-177, 210, 244-247.

**Гісторыя** вёскі ў асобах. Шапяцюк Уладзімір Васільевіч // Малой радзімы прыцяжэнне : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 475-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах вёсак Лелікава, Павіцце Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2021. – С. 29-30 : фат. - (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**65 гадоў з дня нараджэння У. В. Шапяцюка** (1958) // // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. - С. 97.

**Помнікі** воінам-інтэрнацыяналістам. Лелікава Мемарыяльная дошка Шапецюку У. В. = Пахаванне воіна-інтэрнацыяналіста Шапецюка У. В. Помнік з лопасцю шрубакрылай машыны, сімвалізуючай апошні палёт Уладзіміра Шапецюка // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 134-135 : фота.

**Гордость** и боль (воины-интернационалисты Кобринщины) : дайджест / Кобринская центральная районая библиотека, отдел библиотечного маркетинга. – Кобрин, 2012. - 6 с.

**Бялоў, Д.** Ушанавалі памяць герояў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 18 лютага. — С. 2.

У в. Лелікава шануюць памяць аб загінуўшым воіне-інтэрнацыяналісце У. Шапяцюку.

**Буховская, Я.** Увы, погибших не вернуть / Янина Буховская, Юлия Вазнюк // Кобрин-информ. - 2014. — 20 февраля. — С. 6.

Память о подвиге офицера В. В. Шепетюка, погибшего в Афганистане, бережно хранит родная деревня Леликово.

**Казакова, А.** Если бы он был жив... / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2014. — 13 февраля. — С. 4.

Воспоминания матери погибшего воина-интернационалиста Владимира Шепетюка Марии Никандровны.

**В честь** воина-афганца // Кобрынскі веснік. - 2006. – 15 красавіка.

Имя земляка-афганца В. Шепетюка будет носить Леликовская средняя школа.

**Мельник, Р.** Без права на забвение / Роман Мельник // Кобрынскі веснік. - 2006. - 18 лютага. - С. 1.

О воинах-интернационалистах Кобринщины, упоминается В. Шепетюк.

**Пустовой, Е.** Афганская повесть / Е. Пустовой // Кобрин-информ. - 2005. - 17 февраля. - С. 2.

О герое афганской войны В. Шепетюке, уроженце д. Леликово.

**Балка, М.** День памяти / М. Балка // Кобрынскі веснік. - 2004. - 3 лістапада. - С. 2.

О воине-интернационалисте из Леликово В. Шепетюке, погибшем в Афганистане.

**Бурдыка, В.** «Владимир Шепетюк» снова в строю / Владимир Бурдыка // Заря. - 2002. - 5 марта. - С. 2.

В Кобрине вышел на линию автобус «Владимир Шепетюк», изготовленный из металлолома, собранного пионерами Кобринщины.

**Харламаў, А.** Памяці земляка / А. Харламаў // Настаўніцкая газета. - 2002. - 23 сакавіка. - С. 1.

Аўтобус «Уладзімір Шапяцюк» зроблены ў гонар земляка-інтэрнацыяналіста з в. Лелікава.

**Хільчук, М.** Памяць, удзячнасць, вера / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. - 2002. - 27 лютага. - С. 1.

Шмат гадоў на дарогах раёна і вуліцах горада курсіруе аўтобус «Уладзімір Шапяцюк».

Кобрынскі раён
Лелікава
Афганская вайна (1979–1989)
Шапяцюк Уладзімір Васільевіч
Воіны-інтэрнацыяналісты
Ваенныя лётчыкі
Верталётчыкі